няў тады, калі яны ўспомняць факты барацьбы працоўных за сацыяльнае вызваленне, за свабоду і незалежнасць (паўстанне Спартака, Жакерыя, паўстанне У. Тайлера, сялянскія войны ў Расіі і інш.). Тут належыць падкрэсліць, што бяссілле не было абсалютным, а адносным. Справа ў тым, што паражэнні народных мас у барацьбе з эксплуататарскімі класамі выклікалі ў іх не толькі гнеў і абурэнне, прыліў новых сіл, але і бяссілле перад магутнасцю эксплуататараў.

Аналізуючы другую частку ленінскай фразы аб бяссіллі дзікуна ў барацьбе з прыродай, якое нараджае веру ў багоў, чарцей і цуды, належыць звярнуцца да матэрыялу V класа. Цяпер ён выкліча ў старшакласнікаў асаблівую цікавасць. Ленінская думка напоўніцца канкрэтным зместам.

Вывучэнне тэксту артыкула У. І. Леніна «Сацыялізм і рэлігія» ў IX класе мае асобае значэнне для фарміравання ў свядомасці школьнікаў аднаго з важнейшых палажэнняў марксісцка-ленінскай навукі аб прычынах узнікнення рэлігіі, паказвае пры гэтым яе зямное паходжанне. Прывёўшы ў сістэму веды, атрыманыя ў папярэдніх класах, вучні пераканаюцца, што рэлігія — з'ява гістарычная, якая ўзнікла на пэўнай ступені развіцця грамадства і пазнанняў чалавека. З гэтага вынікае заканамернасць яе знікнення на шляху далейшага развіцця чалавецтва.

Гаворачы пра марксісцкі падыход да вырашэння пытанняў паходжання і сацыяльнай сутнасці рэлігіі, нельга не звярнуць увагу школьнікаў на тое, што КПСС у сваёй дзейнасці заўсёды зыходзіць з указанняў У. І. Леніна, што змагацца з рэлігійным туманам належыць «чыста ідэйнай, толькі ідэйнай зброяй» (ПЗТ, т. 12, с. 145).

# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ Ў 1921—1925 гг.

**Э. Р. ІОФЕ,**
**кандыдат гістарычных навук**

Заканчэнне грамадзянскай вайны і разгром замежнай ваеннай інтэрвенцыі сталі пачаткам новага этапа барацьбы за сацыялізм у нашай краіне. У ліпені 1920 г. большая частка Беларусі была вызвалена ад белапольскай акупацыі. Яшчэ не быў падпісан мірны дагавор з урадам буржуазна-памешчыцкай Польшчы, яшчэ Чырвоная Армія граміла бандыцкія атрады Булак-Булаховіча і Савінкава, а на вызваленай ад інтэрвентаў беларускай зямлі пачалося мірнае сацыялістычнае будаўніцтва.

У складаных і цяжкіх умовах аднаўленчага перыяду неабходна было ліквідаваць непісьменнасць і развіць школьную сетку; падрыхтаваць шматлікія кадры новай савецкай інтэлігенцыі; дабіцца росквіту сацыялістычных па змесце і нацыянальных па форме літаратуры і мастацтва, зрабіць іх магутнай ідэйнай зброяй у барацьбе за авалоданне масамі; узняць культурны ўзровень і палітычную свядомасць працоўных, выхаваць з іх актыўных будаўнікоў новага грамадства. Вось што складала сутнасць культурнай рэвалюцыі, якая разгарнулася пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў Краіне Саветаў, у тым ліку і ў Беларусі.

Камуністычная партыя і ўрад рэспублікі праявілі вялікія клопаты аб развіцці новай, сацыялістычнай культуры. Трэба мець на ўвазе тыя асаблівасці, якія былі характэрныя для разгортвання культурнай рэвалюцыі ў Беларусі: мізэрная колькасць нацыянальных кадраў, адсутнасць нацыянальных школ і іншых навучальных устаноў, якія маглі б стаць асновай для разгортвання культурнага будаўніцтва, і г. д.

Кіруючыся рашэннямі ЦК РКП(б), ЦБ КП(б), Кампартыя Беларусі і ўрад рэспублікі разгортвалі вялікую культурна-выхаваўчую работу. Спачатку яна была накіравана на ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці, на арганізацыю на новых асновах школьнай справы і ўсёй народнай асветы, на стварэнне разгалінаванай сістэмы культурна-асветных устаноў і палітычнага выхавання працоўных

у духу савецкага патрыятызму, у духу разумення пераваг сацыялістычнага ладу над капіталістычным.

З сярэдзіны снежня 1920 г. у БССР пачалася ліквідацыя непісьменнасці, неабходнасць чаго была больш чым відавочнай — колькасць непісьменных у той час у рэспубліцы (Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні) складала 68 % (Фнрсова Е. И. Осуществленне в Белоруссии леннпских ндей о всеобщей грамотности. Мн., 1970, с. 22). Узначаліла гэту работу Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці пры палітасвеце Наркамасветы БССР. Вясной 1921 г. толькі ў адным Мінску было адкрыта 108 пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці, у якіх навучалася 3197 чалавек (1584 мужчыны і 1613 жанчын). З лістапада 1920 г. па лістапад 1921 г. урад Савецкай Беларусі выдаткаваў на гэтыя мэты 1182 пачкі паперы, 21 470 ручак і алоўкаў, 496 каробак пер'яў, 10 тыс. штук чарнільных парашкоў, 7 тыс. экземпляраў разразных азбук, 80 тыс. экземпляраў буквароў «Прэч непісьменнасць». У сярэдзіне 1924 г. у БССР паявіліся першыя ячэйкі таварыства «Прэч непісьмениасць». Толькі за адзін 1924/25 навучальны год яны на свае сродкі стварылі 1858 пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці, у якіх займалася 32 тыс. чалавек. Ва ўмовах матэрыяльных цяжкасцей разгортвалася і школьнае будаўніцтва. У 1921/22 навучальным годзе ў Савецкай Беларусі было ўжо 4903 школы ўсіх тыпаў.

16 лютага 1922 года Наркамасветы БССР прыняў новую сістэму народнай адукацыі ў Беларусі, згодна з якой асноўнай школай рэспублікі станавілася сямігадовая працоўная агульнаадукацыйная і політэхнічная школа. Яна ахоплівала дзяцей ва ўзросце ад 8 да 15 гадоў і рыхтавала да прафесіянальнага навучання ў чатырохгадовых тэхнікумах. Гэта накіроўвала школьнае будаўніцтва ў нашай рэспубліцы па шляху, па якім ішлі і іншыя савецкія рэспублікі, адпавядала задачам папаўнення народнай гаспадаркі кадрамі кваліфікаваных спецыялістаў.

Разгортванне культурнага будаўніцтва адбывалася пры падтрымцы братніх савецкіх рэспублік. Асаблівую дапамогу Савецкай Беларусі аказала РСФСР. У 1920 г. з Масквы для патрэб школьнай адукацыі прыйшло некалькі вагонаў шкла, вагон са сшыткамі, кнігамі і рознымі дапаможнікамі. 100 млн. руб. асігнаваў Наркамасветы РСФСР Мінскай губерніі на рамоит школ (Каменская Н. В. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть. 1919—1920 гг. Мн., 1963, с. 246). 5 лістапада 1920 г. бюджэтная камісія Наркамасветы РСФСР выдаткавала БССР на гэтыя ж мэты 1 125 069 500 руб. 19 студзеня 1921 г. Саўнарком РСФСР абавязаў Народны Камісарыят працы і Народны Камісарыят асветы адкамандзіраваць у распараджэнне Наркамасветы Беларусі ўсіх работнікаў асветы, ураджэнцаў Беларусі, для работы па сваёй спецыяльнасці. У першай палавіне 1921 г. толькі з Уфы ў Беларусь прыехала 200 настаўнікаў, 27 культурна-асветных работнікаў, 21 медработнік, 28 бухгалтэраў і іншыя спецыялісты.

У тым жа годзе БССР атрымала з Масквы 1500 пудоў паперы і на 100 млн. рублёў прадметаў рознага вучэбнага і гаспадарчага абсталявання для школ і дзіцячых устаноў. У жніўні 1922 г. СНК РСФСР прыняў рашэнне аб выданні для Беларусі ў друкарнях Масквы і Петраграда кніг на беларускай мове. У наступным годзе Масква прыслала 1000 дзіцячых паліто, 1500 пудоў паперы, 50 тыс. падручнікаў для вучняў пачатковых класаў, 180 тыс. сшыткаў і інш.

Кампартыя і ўрад рэспублікі надавалі вялікае значэнне развіццю бібліятэчнай справы. 15 верасня 1922 г. Саўнарком БССР прыняў дэкрэт аб адкрыцці ў Мінску Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі (цяпер бібліятэка імя У. І. Леніна). К канцу аднаўленчага перыяду ў ёй было каля 300 тыс. тамоў кніг. У беларускі аддзел бібліятэкі ўваходзілі калекцыі вядомых даследчыкаў гісторыі і культуры Беларусі — акадэміка Я. Карскага, прафесараў М. А. Янчука, П. А. Жуковіча і інш. З 1922 г. Беларуская дзяржаўная бібліятэка пачала атрымліваць экземпляр выданняў з іншых рэспублік.

К канцу аднаўленчага перыяду ў Савецкай Беларусі існавалі Беларуская кніжная палата, Беларускі дзяржаўны музей з аддзяленнямі ў Віцебску і Магілёве, краязиаўчыя музеі ў радзе гарадоў, Дом-музей I з'езда РСДРП, адкрыты ў 1923 г.

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр быў адкрыты 14 верасня 1920 г., а Беларускі савецкі тэатр яшчэ раней — у 1918 г. Тут працавалі маладыя таленавітыя акцёры Л. І. Ржэцкая, С. М. Станюта, А. К. Ільінскі і многія іншыя. Мастацкім кіраўніком Беларускага дра-

матычнага тэатра стаў петраградскі акцёр і рэжысёр Е. А. Міровіч.

Падрыхтоўку кадраў спецыялістаў для народнай гаспадаркі і культуры нельга было вырашыць без стварэння ў рэспубліцы вышэйшых навучальных устаноў. Іх у дарэвалюцыйны час тут не было. Амаль адразу пасля вызвалення Мінска ад белапалякаў перад Наркамасветы было пастаўлена пытанне аб рэарганізацыі Мінскага політэхнічнага вучылішча ў інстытут. Беларускі політэхнічны інстытут пачаў сваю работу 10 снежня 1920 г. 30 кастрычніка 1921 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Выступаючы на гэтым пасяджэнні, яго рэктар У. І. Пічэта сказаў: «Толькі вялікая рэвалюцыя расійская распрыгоніла працоўныя масы, дала магчымасць распрыгоніць народную асвету, прыблізіўшы яе да пралетарыята, прыблізіўшы пралетарыят да асветы. Адкрыццё БДУ — падзея вялікай культурнай і палітычнай важнасці. Яна дае штуршок для развіцця беларускай культуры, будзе развіваць яе і пакажа ўсяму свету, чаго можа дасягнуць народ, які разбіў кайданы бяспраўя і рабства» (Вестник Наркомпроса ССРБ, 1921, № 1).

Буйнейшая навучальная ўстанова Савецкай Беларусі была створана дзякуючы вялікай дапамозе з боку РСФСР і іншых савецкіх рэспублік. Для БДУ ў Маскве быў забраніраваны фонд навуковай літаратуры. Маскоўскі, Петраградскі і Кіеўскі універсітэты направілі Беларускаму універсітэту вучэбныя дапаможнікі і частку абсталявання для навуковых лабараторый. За перыяд з кастрычніка 1921 г. да сакавіка 1922 г. БДУ атрымаў ад Наркамфіна РСФСР 1 190 350 руб. Усяго на абсталяванне універсітэта было асігнавана каля 40 млрд. руб.

Брацкія савецкія рэспублікі, і ў першую чаргу РСФСР, аказалі БДУ не толькі матэрыяльна-тэхнічную і фінансавую дапамогу, але і накіроўвалі сюды працаваць буйных вучоных, спецыялістаў. У першым 1921/22 навучальным годзе ва універсітэце вучылася 1390 студэнтаў, працаваў 81 выкладчык, у тым ліку 14 прафесароў. Большасць з іх прыехала з Масквы, Петраграда, Кіева, Казані, Смаленска і іншых гарадоў.

Да канца аднаўленчага перыяду ў рэспубліцы працавалі, акрамя універсітэта, Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках, Віцебскі ветэрынарны інстытут, Камуністычны універсітэт імя У. І. Леніна, адкрыты ў 1925 г. на базе Цэнтральнай саўпартшколы ў Мінску.

Стварэнне вышэйшых навучальных устаноў у Савецкай Беларусі, рост колькасці спецыялістаў па розных галінах ведаў садзейнічалі падрыхтоўцы навуковых кадраў, развіццю навукі. Рашэннем ЦВК БССР пры Наркамасветы рэспублікі 10 лютага 1921 г. была створана Навукова-тэрміналагічная камісія па распрацоўцы беларускай навуковай тэрміналогіі. У яе склад уваходзілі гуманітарная, прыродазнаўчая і матэматычная секцыі. Толькі за першыя месяцы свайго існавання камісія апрацавала звыш 2 тыс. тэрмінаў. 30 студзеня 1922 г. на аснове Навукова-тэрміналагічнай камісіі быў арганізаваны Інстытут беларускай культуры — першая навукова-даследчая ўстанова Савецкай Беларусі. У распрацоўцы Статута Інбелкульта актыўна ўдзельнічалі выдатны вучоны-філолаг і этнограф акадэмік Я. Ф. Карскі, вядомы вучоны-гісторык рэктар БДУ У. І. Пічэта, таленавіты мастацтвазнаўца Я. Л. Дыла. Інстытут беларускай культуры павінен быў арганізаваць планамернае вывучэнне этнаграфіі, мовы, літаратуры, мастацтва, гісторыі, геаграфіі, прыроды, эканомікі, сацыяльна-грамадскага руху Беларусі, аб'яднаць і каардынаваць навукова-даследчую работу, якую праводзілі ўстановы навукі і мастацтва, вышэйшыя навучальныя ўстановы і асобныя вучоныя рэспублікі.

Спачатку інстытут меў дзве секцыі: гуманітарную, у склад якой уваходзілі слоўнікавая, тэрміналагічная і літаратурна-даследчая камісіі, і прыродазнаўчую з геолага-глебавай камісіяй. Першым старшынёй Інбелкульта быў С. М. Некрашэвіч. Старшынёй гуманітарнай секцыі інстытута прызначылі Янку Купалу, а яе членамі — Якуба Коласа і Змітрака Бядулю.

Навукова-даследчую работу ў галіне гісторыі і археалогіі Беларусі праводзілі спачатку гісторыка-археалагічная секцыя, а затым камісія, якую ўзначаліў вядомы даследчык М. В. Доўнар-Запольскі. Да творчых дасягненняў гісторыкаў таго часу адносіцца асвятленне шэрагу пытанняў securecanamічнага і палітычнага развіцця, а таксама культуры беларускага народа ў XVI — першай палавіне XIX стагоддзя. У студзені 1926 г. у Мінску адбыўся скліканы Інбелькультам першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі. Асаблівую цікавасць выклікалі даклады А. Ляўданскага «Аб беларускіх гарадзішчах» (даклад быў ілюстраваны пла-

намі 350 абследаваных беларускіх гарадзішчаў) і К. Палікарповіча «Аб даследаваннях стаянак першабытнага чалавека ў нізоўі Сожа». Часопіс «Советское строительство» так пісаў аб выніках працы экспедыцыі К. Палікарповіча: «Апошнія раскопкі гісторыка-археалагічнай камісіі па рацэ Сож, якія адкрылі палеалітычную стаянку, маюць каштоўнасць не толькі для беларускай навукі, але і для сусветнай археалагічнай навукі...» (Советское строительство, 1927, № 9, с. 99).

Значныя поспехі мела этнаграфічная секцыя Інбелкульта. Толькі ў 1923 г. было праведзена 5 этнаграфічных экспедыцый у Быхаўскі, Слуцкі і іншыя раёны рэспублікі. Пад кіраўніцтвам членаў секцыі студэнты БДУ падрыхтавалі даклады: «Факты перажыткаў першабытнай культуры ў абрадах беларусаў», «Купалле», «Беларускія Дзяды і Прадзедкі», «Галаўныя ўборы беларускай жанчыны». Асобна трэба адзначыць работу І. А. Сербава, які да канца 1925 г. закончыў манаграфічныя працы «Вічынскія паляне, этнаграфічны нарыс басейна р. Цны» і «Радзімічы. Этнаграфічны нарыс басейна р. Узы». Акрамя прадметаў з курганоў, вучоны сабраў амаль 200 этнаграфічных экспанатаў (адзенне, галаўныя ўборы, мастацкае рукадзелле). На фанограф І. А. Сербаў запісаў 50 бытавых песень.

Вялікую работу праводзіла літаратурная секцыя Інстытута беларускай культуры. Яе арганізавалі ў лютым 1925 г. Старшынёй быў Цішка Гартны, сакратаром — Змітрок Бядуля. У сакавіку 1925 г. пачала працаваць камісія па выданню твораў беларускай літаратуры, якую ўзначаліў вядомы літаратуразнаўца прафесар БДУ І. І. Замоцін. Пад яго кіраўніцтвам ажыццявілася навуковае выданне твораў М. Багдановіча і А. Гаруна.

Мастацкая секцыя Інбелкульта на чале з Я. Л. Дылам арганізавала першую Усебеларускую мастацкую выстаўку ў Маскве. Змястоўнасць, навізна тэматыкі, вобразнае адлюстраванне жыцця савецкага народа рабілі гэту выстаўку вельмі адметнай. Секцыя беларускага мастацтва падрыхтавала таксама пераклады на беларускую мову такіх твораў, як «Антыгона» Сафокла, «Вакханкі» Эўрыпіда, «Віндзорскія гарэзніцы» Шэкспіра.

З 1924 г. у сістэме Інбелкульта было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК). З гэтага часу краязнаўчы рух на Беларусі набыў арганізаваны характар. ЦБК зарэгістравала ўсе краязнаўчыя арганізацыі БССР, звязалася з галоўнымі краязнаўчымі ўстановамі саюзных рэспублік, а ў сакавіку 1924 г. наладзіла спачатку Мінскую, а потым Усебеларускую канферэнцыі. З кастрычніка 1925 г. Цэнтральнае бюро краязнаўства пачало выдаваць часопіс «Наш край», галоўным рэдактарам якога прызначылі Змітрака Бядулю. Адным з актывістаў мясцовай краязнаўчай арганізацыі стаў В. Ф. Купрэвіч, будучы прэзідэнт АН БССР. Сіламі краязнаўцаў і супрацоўнікаў Інбелкульта ў рэспубліцы была разгорнута шырокая музейная работа. У 1927 г. у БССР налічвалася 18 музеяў, значную колькасць экспанатаў якіх складалі прадметы быту.

Адно з галоўных месц у дзейнасці Інстытута беларускай культуры адводзілася вывучэнню прыроды Беларусі. 7 сакавіка 1924 г. была створана прыродазнаўча-геаграфічная секцыя. Асаблівыя поспехі былі дасягнуты ў галіне геалогіі і біялогіі. Яшчэ з лета 1923 г. Б. К. Цярлецкі па даручэнню Дзяржплана заняўся вывучэннем карысных выкапняў у раёнах, якія прымыкалі да Мінска, Чэрвеня і Бабруйска. Былі вызначаны запасы мелу, даследаваны пяскі для вытворчасці шкла ў раёне Койданава (Дзяржынск). Да цяперашняга часу не страцілі сваёй навуковай каштоўнасці працы Г. Н. Высоцкага па дэндралогіі, С. Д. Георгіеўскага па біялогіі лясных парод поўдня Беларусі, В. Г. Касаткіна па флоры лугоў і балот.

25 ліпеня 1924 г. ЦВК і СНК БССР зацвердзілі «Палажэнне аб Інстытуце беларускай культуры», паводле якога Інбелкульт быў вызначаны як вышэйшая дзяржаўная навуковая ўстанова рэспублікі, што ўваходзіць у склад Наркамасветы БССР.

Такія першыя крокі беларускай савецкай навукі і культуры. Яны з'яўляюцца яркім сведчаннем таго, што клопаты аб развіцці духоўных сіл чалавека заўсёды былі штодзённымі клопатамі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.